**Стральчонак А.А.,** *дацэнт*

# ТВОРЧАЕ РАЗВІЦЦЁ АСОБЫ СТУДЭНТА Ў ІНСТРУМЕНТАЛЬНЫМ АНСАМБЛІ

Неабходнасць фарміраваць сёння ў ВНУ творчую асобу стала неадкладнай жыццёвай патрэбнасцю. Асоба сучаснага выпускніка творчай прафесіі павінна быць рознабаковай і глыбокай па зместу, паколькі рознабаковы і разнастайны аб'ект яго дзейнасці. Гэтым аб'ектам з'яўляюцца людзі, розныя па сацыяльнаму складу, прафесійнай прыналежнасці, адукацыі, інтарэсах і г.д. Таму наяўнасць у асобы якасцей, якія адпавядаюць патрабаванням прафесіі, дазваляе гаварыць аб прыгоднасці чалавека да дадзенай прафесійнай дзейнасці.

Падрыхтоўка кіраўнікоў аркестравых і ансамблевых калектываў ажыццяўляецца на розных занятках прадметаў спецыяльнага цыкла. Усе вывучаемыя дысцыпліны і разнастайныя формы практыкі, з якімі студэнт сутыкаецца ў той ці іншай меры, уплываюць на яго творчы рост. Ігра і праца ў ансамблі развіваюць уяўленне аб функцыях розных музычных элементаў ва ўмовах творчай сувязі, што дазваляе разглядаць ансамблевы калектыў як разнавіднасць малога аркестра. Тут асоба не толькі развівае свае здольнасці, але і фарміруе сацыяльныя якасці, неабходныя для прафесіі. Як паказвае практыка, стварэнне аркестравых калектываў пачынаецца з ансамблевых груп. Цяжкасці, з якімі сутыкаюцца многія выпускнікі нашага універсітэта, звязаны з арганізацыйнай работай. Часам творчыя калектывы распадаюца, не паспеўшы сфарміравацца.

Неабходна адзначыць, што не кожны выпускнік зможа стварыць ансамбль або аркестр. Кіраўнік калектыву павінен валодаць многімі якасцямі. Акрамя ведаў, якія ён атрымаў у час вучобы, трэба валодаць арганізатарскімі здольнасцямі. Пры фарміраванні ансамбляў у класе важна вызначыць змест форм і метадаў навучання, якія павышаюць творчую актыўнасць студэнтаў. Нярэдка бывае так, што пры стварэнні ансамбляў недаацэньваюцца матывы, устаноўкі, інтарэсы, псіхалагічная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

несумяшчальнасць, розны ўзровень падрыхтоўкі студэнтаў і інш. У такім выпадку не рэалізуюцца творчыя рэзервы ўдзельнікаў ансамбля, што, у сваю чаргу, не садзейнічае праяўленню іх ініцыятывы. У канчатковым выніку педагог не можа ў рабоце з ансамблем вырашаць мастацкія задачы, якія былі ім пастаўлены.

Іgraвы працэс звязаны не толькі з разумовай дзейнасцю. Ён прасякнуты складанай тканінай эмацыянальных перажыванняў; вялікая роля тут належыць пачуццям. Пачуцці, эмоцыі з'яўляюцца неад'емным элементам творчага працэсу і выконваюць важную ролю ў выхаванні чалавека, у фарміраванні яго актыўнасці. Фарміраваць актыўнасць ў ансамблі - значыць уздзейнічаць не толькі на розум, але і на пачуцці. У гэтай сувязі інструментальны ансамбль як творчы калектыў - гэта група музыкантаў, якая выконвае самастойныя музычныя партыі пры калектыўным рашэнні мастацкіх задач ва ўмовах эмацыянальна-псіхалагічнага кантакту.

Такім чынам, ансамбль з'яўляецца адной з важнейшых форм навучання, якая мае вялікае значэнне ў фарміраванні прафесійных якасцей музыканта. Выкладчык павінен узбудзіць у студэнта інтарэс і любоў да ансамбля, імкненне да арганізацыі розных ансамбляў у творчых калектывах і да шырокай прапаганды гэтага віду музычна-выканальніцкага мастацтва, як аднаго з найбольш даступных і дзейсных сродкаў музычна-эстэтычнага выхавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ